## *1. Агульныя палажэнні*

1.1. Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» (у далейшым па тэксту РПГА «БХК») з'яўляецца самастойным незалежным, некамерцыйным, праваабарончым грамадскім аб'яднаннем, створанным у мэтах ажыццяўлення гуманітарнай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якое працуе на аснове самакіравання і аб'ядноўвае на аснове агульнасці інтарэсаў грамадзян Рэспублікі Беларусь. У сваей дзейнасці незалежны ад дзяржаўных і гаспадарчых органаў, палітычных і грамадскіх арганізацый. Узаемаадносіны з імі ладзяцца на аснове партнёрства, дыялога і супрацоўніцтва.

1.2. Назва аб'яднання:

- на беларускай мове:

поўная - Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінкскі Камітэт»;

скарочаная - РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт».

- на рускай мове:

поўная - Республиканское правозащитное общественное объединение
«Белорусский Хельсинкский Комитет»;
скарочаная - РПОО «Белорусский Хельсинкский Комитет».

1.3. РПГА «БХК» мае статус рэспубліканскага грамадскага аб'яднання, якое дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1.4. РПГА «БХК» будуе сваю працу на прынцыпах добраахвотнасці і раўнапраўнасці яго сяброў, законнасці, галоснасці і калегіяльнасці.

1.5. РПГА «БХК» ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з дзеючай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і прынятымі ў

адпаведнасці з ёю актамі заканадаўства, міжнароднымі дамовамі, ратыфікаванымі Рэспублікай Беларусь, і гэтым Статутам.

1.6. У сваей дзейнасці РПГА «БХК» супрацоўнічае з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі Беларусі і іншых краін.

1.7. РПГА «БХК» з'яўляецца юрыдычнай асобай, якая валодае асабістай маёмасцю, нясе самастойную адказнасць па сваіх абавязальніцтвах, можа ад свайго імя набываць і ажыццяўляць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе, мае самастойны баланс, разліковы, валютны і іншыя рахункі ў банках Рэспублікі Беларусь і, ва ўстаноўленым парадку, ва ўстановах банкаў іншых краін, мае пячатку, штампы, бланк са сваей назвай, сімволіку, зарэгістраваную ва ўстаноўленым парадку.

1.8. Справаводства ў РПГА «БХК» вядзецца ва ўстаноўленым парадку. Дакументацыя, вызначаная заканадаўствам, здаецца ва ўстановы, якія зберагаюць Нацыянальны Архіўны Фонд па месцы знаходжання юрыдычнай асобы.

1.9. Аб сваей ліквідацыі або рэарганізацыі РПГА «БХК» паведамляе ў сродках масавай інфармацыі.

1.10. РПГА «БХК» можа ўваходзіць і ствараць міжнародныя і іншыя саюзы (асацыяцыі) грамадскіх арганізацый, дзейнасць якіх адпавядае статутным мэтам і задачам РПГА «БХК».

1.11. Юрыдычны адрас кіруючага органа: 220036, г. Мінск, вул. К. Лібкнехта 68, пакой 1201.

## *2. Мэты, задачы, прадмет і метады дзейнасці*

2.1. Мэта РПГА «БХК» - ажыццяўленне гуманітарнай дзейнасці па абароне ў Беларусі правоў чалавека, гарантаваных Канстытуцыяй

Рэспублікі Беларусь, дзеючым заканадаўствам, а таксама дэклараваных Хельсінкскімі пагадненнямі, іншымі міжнароднымі дамовамі аб правах чалавека, інфармаванне грамадскасці аб сітуацыі з правамі чалавека у Беларусі і свеце.

2.2. Прадметам дзейнасці РПГА «БХК» з'яўляецца садзейнічанне дзяржаўным і грамадскім інстытутам ва ўмацаванні і развіцці правоў чалавека, назіранне за іх выкананнем, садзейнічанне ў абароне правоў і інтарэсаў грамадзян.

2.3. РПГА «БХК» дзейнічае для выканання наступных задачаў:

- арганізацыі сістэматычнага назірання за выкананнем пагадненняў аб правах чалавека ў Рэспубліцы Беларусь;
- падрыхтоўцы справаздач, даследаванняў, артыкулаў і іншых матэрыялаў, якія складаюць інфармацыю пра становішча з выкананнем нацыянальнага заканадаўства і міжнародных пагадненняў аб правах чалавека ў Рэспубліцы Беларусь;
- распаўсюджванню гэтых матэрыялаў;
- стварэнню інфармацыйнага банка дадзеных пра выпадкі парушэння правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь;
- арганізацыі не забароненых дзеючым заканадаўствам формаў грамадскай дзейнасці, звязаных з абаронаю правоў чалавека ў Беларусі;
- прапагандзе дакументаў у падтрымку правоў чалавека;
- падрыхтоўцы навуковай і папулярнай літаратуры па правах чалавека.

2.4. Метады дзейнасці РПГА «БХК»:

- арганізацыя і падтрыманне кантактаў з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі як у Беларусі, так і за яе межамі, якія маюць дачыненне да абароны правоў чалавека;

- арганізацыя незалежнай грамадскай юрыдычнай экспертызы заканадаўчых і падзаконных актаў Рэспублікі Беларусь на прадмет адпаведнасці пагадненням і заканадаўству аб правах чалавека;
- прапаганда вопыта дзяржаўных і грамадскіх арганізацый іншых краін па абароне правоў чалавека;
- выданне праваабарончай літаратуры, у тым ліку і перыядычнай;
- уздзеянне іншымі метадамі і спосабамі на стан грамадскай думкі ў галіне выканання правоў чалавека ў межах існуючага заканадаўства.

## 3. *Правы РПГА "БХК"*

3.1. РПГА «БХК» мае права:

- бесперашкодна атрымліваць, захоўваць і распаўсюджваць інфармацыю, якая мае дачыненне да статутнай дзейнасці РПГА «БХК»;
- ствараць асабістыя і карыстацца ва ўстаноўленым парадку іншымі сродкамі масавай інфармацыі;
- ажыццяўляць выдавецкую дзейнасць, якая мае дачыненне да дзейнасці РПГА «БХК» ва ўстаноўленым парадку;
- абараняць ва ўстаноўленым законам парадку правы і законныя інтарэсы асобаў, якія лічаць, што іх правы парушаны і якія звярнуліся ў РПГА «БХК», у судах, дзяржаўных, гаспадарчых, грамадскіх органах і арганізацыях;
- праводзіць кангрэсы, канферэнцыі і іншыя навуковыя і грамадскія мерапрыемствы для выканання статутных мэтаў і задач;

- заключаць дамовы і іншыя пагадненні, набываць маёмасныя і немаёмасныя правы і абавязкі, выступаць істцом і адказчыкам у судзе;
- мець ва ўласнасці: будынкі, збудаванні, транспарт, кампутарную тэхніку, іншую маёмасць, неабходную для матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці, прадугледжанай Статутам, за выключэннем аб'ектаў, якія згодна з законам могуць знаходзіцца толькі ва ўласнасці дзяржавы;
- аказваць матэрыяльную і іншыя віды дапамогі сваім сябрам, накіроўваць іх на лячэнне, вучобу, павышэнне кваліфікацыі па рашэнню Рады БХК.

### *4. Сяброўства. Правы і абавязкі сяброў*

4.1. Сябрам РПГА «БХК» можа стаць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 18-гадовага ўзросту і які прызнае дадзены Статут, пісьмова засведчыў свае жаданне працаваць дзеля выканання мэтаў і задач РПГА «БХК» і падаў адпаведную заяву. Дапускаецца сяброўства грамадзян іншых краін і асобаў без грамадзянства.

4.2. Прыём у сябры РПГА «БХК» ажыццяўляецца па рэкамендацыі двух сяброў РПГА «БХК» Радай РПГА «БХК» або Сходам аддзялення і зацвярджаецца Радай РПГА «БХК». Рада РПГА «БХК» вядзе ўлік сяброў аб’яднання ў спецыяльным журнале. Звесткі аб прыняцці і выхадзе сяброў аб’яднання ўносяцца не пазней за месячны тэрмін з моманту прыёма ці выхада сябра аб’яднання. Звесткі, неабходныя для ўнясення ў журнал вызначаюцца Радай РПГА «БХК».

4.3. Выхад з РПГА «БХК» вольны, афармляецца на падставе заявы ў

Раду РПГА «БХК» у пісьмовай форме. За грубыя і сістэматычныя парушэнні Статута РПГА «БХК» Рада мае права спыніць сяброўства па прапанове Старшыні, трох сяброў Рады ці па рашэнню схода аддзялення.

4.4. Сябру РПГА «БХК» выдаецца членскі білет устаноўленага ўзору.

4.5. Сябра РПГА «БХК» мае права:

- абіраць і быць абраным у выбарныя органы РПГА «БХК»;
- удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах РПГА «БХК»;
- атрымліваць неабходную інфармацыю ад Сакратара і Старшыні БХК па пытаннях дзейнасці арганізацыі;
- карыстацца архівам РПГА «БХК».

4.6. Сябра РПГА «БХК» абавязаны:

- выконваць Статут РПГА «БХК»;
- працаваць дзеля выканання статутных мэтаў і задач РПГА «БХК»;
- браць удзел у сходах аддзяленняў РПГА «БХК»;
- выконваць рашэнні, прынятыя Сходам прадстаўнікоў, Радай РПГА «БХК», сходамі аддзяленняў;

## 5. *Арганізацыйная структура*

5.1. Вышэйшым органам РПГА «БХК» з'яўляецца Сход прадстаўнікоў. Кіруючым органам паміж Сходамі прадстаўнікоў з'яўляецца Рада. Пры Радзе ствараецца Назіральны Сойм, які выконвае дарадчыя функцыі.

5.2. Сход прадстаўнікоў:

- складаецца са Старшыні БХК, сяброў Рады і Назіральнага Сойма, дэлегатаў, абраных на рэгіянальных сходах або сходах аддзяленняў, калі такія ствараліся. Парадак правядзення сходаў і

квоту для абрання дэлегатаў вызначае Рада РПГА «БХК»;

- прымае рашэнні па ўсіх пытаннях, звязаных з дзейнасцю РПГА «БХК», яго рашэнні не абскарджваюцца;
- абірае Раду, Кантрольную Камісію РПГА «БХК», Назіральны Сойм і яго Старшыню;
- абірае Старшыню РПГА «БХК» і яго намесніка;
- раз у два гады разглядае справаздачу аб дзейнасці Рады, Кантрольнай Камісіі і Старшыні БХК;
- заслухоўвае інфармацыю Кантрольнай Камісіі аб выдаткаванні фінансавых сродкаў;
- уносіць змены і (ці) дадаткі ў Статут;
- прымае рашэнні аб спыненні дзейнасці, рэарганізацыі і ліквідацыі РПГА «БХК»;

5.3. Сход прадстаўнікоў лічыцца правамоцным пры наяўнасці больш за 1/2 прадстаўнікоў, калі яны своечасова інфармаваныя аб яго скліканні, што пацвярджаецца Сакратаром Рады, акрамя тых пунктаў парадку дня, якія агавораныя п. 5.5. дадзенага Статута.

5.4. Сход прадстаўнікоў прымае рашэнні простай большасцю галасоў па ўсіх пытаннях, акрамя тых выпадкаў, якія агавораны п.5.5.

5.5. Пытанні па выбарах Рады, Старшыні, спыненні дзейнасці, рэарганізацыі або ліквідацыі РПГА «БХК» вырашаюцца толькі ў прысутнасці не менш за 2/3 вызначанага складу. Для вырашэння гэтых пытанняў патрэбна большасць у 2/3 галасоў прысутных на Сходзе.

5.6. Сход прадстаўнікоў склікаецца па прапанове не менш за трох сяброў Рады РПГА «БХК», Старшыні або намесніка Старшыні РПГА «БХК», але не радзей 1-го разу на 2 гады.

5.7. Рада РПГА «БХК»:

- абіраецца на два гады па рашэнню Сходу прадстаўнікоў і можа складацца з 5-ці, але не больш 7-мі сяброў РПГА «БХК»;
- склікаецца не радзей за 1 раз на два месяцы па прапанове Старшыні, намесніка Старшыні РПГА «БХК» ці 3-х сяброў Рады РПГА «БХК». Пасяджэнне Рады лічыцца правадзейным пры наяўнасці больш за палову сяброў Рады. Рашэнне прымаецца простай большасцю галасоў ад прысутных. кіруе дзейнасцю РПГА «БХК» на падставе рашэнняў сходаў;
- прымае рашэнні аб набыцці, распараджэнні маёмасцю, матэрыяльнай падтрымцы сяброў РПГА «БХК»;
- зацвярджае ўзоры сімволікі, пячаткі, іншай атрыбутыкі РПГА «БХК»;
- вырашае пытанні аб прыёме ці выключэнні з сяброў РПГА «БХК» і прадстаўляе Сходу прадстаўнікоў на зацвярджэнне;
- вызначае парадак дня Сходу прадстаўнікоў;
- абірае Сакратара са складу сяброў РПГА «БХК»;
- уносіць змены і (ці) дапаўненні ў Статут, звязаныя са зменай юрыдычнага адраса РПГА «БХК» або абумоўленыя зменамі ў заканадаўстве;
- вылучае сяброў РПГА «БХК» у якасці грамадскіх абаронцаў і прадстаўнікоў на судовыя працэсы;
- разглядае іншыя пытанні ў межах сваей кампетэцыі.

5.8 Старшыня РПГА «БХК»:

- абіраецца Сходам прадстаўнікоў БХК на два гады кваліфікаванай большасцю галасоў прысутных (2/3);
- прадстаўляе РПГА «БХК»;
- валодае правамі і паўнамоцтвамі кіраўніка юрыдычнай асобы,

з'яуляецца матэрыяльна адказнай асобай РПГА «БХК»;

- інфармуе Раду аб дзейнасці РПГА «БХК» паміж паседжаннямі Рады;
- кантралюе падрыхтоўку справаздачы аб дзейнасці Рады Сходу прадстаўнікоў;
- каардынуе дзейнасць аддзяленняў РПГА «БХК»;
- прымае рашенні аб прыёме на працу і звальненні з працы тэхнічных супрацоўнікаў РПГА «БХК», заключае працоўныя пагадненні, вырашае памеры і формы ўзнагароды за працу, зробленую па замовах РПГА «БХК» у межах існуючага заканадаўства;
- захоўвае пячатку РПГА «БХК»;
- вядзе прыём грамадзян.

5.9. Намеснік Старшыні РПГА «БХК»:

- абіраецца Сходам прадстаўнікоў на два гады;
- прадстаўляе РПГА «БХК» у адсутнасці Старшыні або па рашэнню Рады;
- кантралюе выкананне рашэнняў Сходу прадстаўнікоў і Рады ў адсутнасць Старшыні;
- мае права склікаць Сход прадстаўнікоў, Раду;
- кантралюе дзейнасць сакратара РПГА «БХК»;
- вядзе прыём грамадзян;

5.10. Кантрольная Камісія РПГА «БХК» складаецца з трох сяброў, якія выбіраюцца Сходам прадстаўнікоў на два гады.

5.11. На першым пасяджэнні сябры Кантрольнай Камісіі выбіраюць старшыню, які кіруе яе працай.

5.12. Кантрольная Камісія:

- кантралюе выкананне Статута сябрамі РПГА «БХК»;
- кантралюе фінансавую дзейнасць РПГА «БХК»;
- кантралюе выкарыстанне маёмасці РПГА «БХК», фінансавых сродкаў РПГА «БХК», інфармуе аб гэтым Сход прадстаўнікоў;
- робіць фінансавую справаздачу Сходу прадстаўнікоў;
- прымае і разглядае пісьмовыя скаргі сяброў РПГА «БХК» на рашэнні яго органаў, акрамя рашэнняў, прынятых Сходам прадстаўнікоў.

5.13. Назіральны Сойм у складзе 9 чалавек з ліку прызнаных грамадскіх дзеячоў Беларусі, а таксама іх старшыня, выбіраецца Сходам прадстаўнікоў на два гады.

5.14. Старшыня Назіральнага Сойму склікае сходы Сойму, якія, як правіла, збіраюцца напярэдадні Сходу прадстаўнікоў.

5.15. Назіральны Сойм мае права:

- абмяркоўваць пытанні выканання статутных мэтаў і задач Радай;
- выступаць з кардынальнымі прапановамі на пасяджэннях Рады і Сходу прадстаўнікоў;
- прымаць рашэнні і пастановы, якія павінны абавязкова разглядацца Радай і Сходам прадстаўнікоў.

5.16. Старшыня Назіральнага Сойму мае права:

- прадстаўляць РПГА «БХК»;
- кантраляваць дзейнасць Старшыні БХК;
- удзельнічаць у фарміраванні парадку дня пасяджэнняў Рады і Сходу прадстаўнікоў.

5.16. У РПГА «БХК» могуць стварацца раённыя, міжраённыя, абласныя аддзялені, каторыя:

- ствараюцца па рашэнню Рады БХК пры наяўнасці не менш за трох

сябраў РПГА «БХК» на адпаведнай тэрыторыі;

- роўныя паміж сабой;
- дзейнічаюць на тэрыторыі, якую вызначае Рада РПГА «БХК»;
- кіруюцца ў сваей дзейнасці Статутам, рашэннямі кіруючых органаў РПГА «БХК» і аддзялення;
- ліквідуюцца па рашэнню Рады РПГА «БХК», якая прызначае асобу, адказную за працэс ліквідацыі.

5.17. Бягучую дзейнасць аддзяленняў каардынуе Старшыня РПГА «БХК».

5.18. Рада РПГА «БХК» можа надаваць аддзяленням правы юрыдычнай асобы.

5.19. Сход аддзялення РПГА «БХК»:

- вырашае пытанні прыёму і выключэння з сяброў РПГА «БХК»;
- абірае старшыню аддзялення, яго намесніка, сяброў рады аддзялення;
- абірае дэлегатамі сяброў аддзялення на Сход прадстаўнікоў;
- вылучае сяброў РПГА «БХК» у якасці прадстаўнікоў і грамадскіх абаронцаў на судовыя працэсы;
- вызначае дзейнасць аддзялення ў адпаведнасці са Статутам і рашэннямі кіруючых органаў РПГА «БХК»;

5.20. Сход аддзялення РПГА «БХК» збіраецца не радзей за адзін раз на год і сазываецца: па ініцыятыве ня менш за адной трэці спісачнага складу сяброў аддзялення, Старшынёй аддзялення ці яго Рэвізорам, Старшынёй РПГА «БХК» ці яго намеснікам, Радай РПГА «БХК».

5.21. Старшыня аддзялення прадстаўляе аддзяленне РПГА «БХК» у межах сваей кампетэнцыі і кіруе дзейнасцю аддзялення паміж

Сходамі, вырашае пытанні дзейнасці аддзяленя, акрамя тых, што аднесены да кампетэнцыі Сходу аддзялення.

5.22. Старшыня аддзялення адказвае за захаванне маёмасці РПГА «БХК», перададзенай на карыстанне аддзялення і распаражаецца ею па мэтаваму прызначэнню. Права распаражэння маёмасцю можа быць перадана Радай РПГА «БХК» Старшыні аддзялення па даверанасці з заключэннем дамовы аб поўнай матэрыяльнай адказнасці ў адпаведнасці бягучым заканадаўствам.

5.23. Рэвізор адзялення абіраецца Сходам аддзяленя тэрмінам на 2 гады.

5.24. Рэвізор кантралюе выкананне Статута і фінансавую дзейнасць у адзяленні,

## *6. Фінансавыя сродкі і маёмасць.*

6.1. Фінансавыя сродкі і маёмасць РПГА «БХК»могуць складацца з:

- добраахвотных ахвяраванняў;
- сяброўскіх складак;
- дарункаў;
- іншых паступленняў, не забароненых дзеючым заканадаўствам.

6.2. Грашовыя сродкі РПГА «БХК» захоўваюцца на банкаўскіх рахунках і выдаткоўваюцца на ўтрыманне тэхнічных работнікаў, арэнду памяшканняў, транспарту, правядзенне мерапрыемстваў, прадугледжаных гэтым Статутам, на камандыровачныя, гаспадарчыя і канцылярскія выдаткі, а таксама на ўзнагароды за выкананую па заданнях Рады і Старшыні БХК працу, поспехі ў грамадскай дзейнасці, іншых вызначаных Радай БХК мерапрыемствах.

6.3. Правам падпісання фінансавых дакументаў надзяляюцца

Старшыня БХК (падчас яго адсутнасці - наменснік Старшыні) і бухгалтар.

6.4. Кантроль за выкарыстаннем грашовых сродкаў і маёмасці РПГА «БХК» ускладаецца на Кантрольную Камісію.

6.5. РПГА «БХК» не адказвае за абавязальніцтвы сваіх сяброў, сябры не адказваюць за абавязальніцтвы РПГА «БХК».

## *6. Парадак рэарганізацыі і ліквідацыі*

7.1. Дзейнасць РПГА «БХК» можа быць спынена шляхам рэарганізацыі (зліцця, далучэння, раздзялення), або ліквідацыі толькі па рашэнню Схода прадстаўнікоў згодна п. 5.5. дадзенага Статута, або па рашэнню Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

7.2. Пасля прыняцця рашэння аб ліквідацыі на Сходзе прадстаўнікоў ствараецца Ліквідацыйная Камісія. Яна вызначае парадак выкарыстання ўласнасці РПГА «БХК» на мэты і задачы, прадугледжаныя гэтым Статутам.